# НА РУБЯЖЫ ДЗВЮХ ЭПОХ

Даследаванне сацыяльна-эканамічнай гісторыі гарадоў з'яўляецца адной з важнейшых задач савецкай гістарычнай навукі. Нягледзячы на тое што для феадальнага спосабу вытворчасці ў цэлым характэрна панаванне натуральнай гаспадаркі і «для сярэдневякоўя зыходным пунктам служыла вёска» (Маркс К. і Энгельс Ф. Творы. Т. 3. С. 22), горад з'яўляўся істотнай часткай феадальнага грамадства, твар якога ў многім вызначаўся развіццём гарадоў і іх удзельнай вагой у эканоміцы краіны. Гісторыя феадальнага горада цесна звязана з гісторыяй развіцця капіталістычнага горада, капіталістычнай прамысловасці, фарміраваннем прамысловага пралетарыяту і буржуазіі. Горад з'яўляўся неад'емным звяном у станаўленні і развіцці капіталістычных адносін. Іменна гэтым можна растлумачыць цікавасць да кнігі А. М. Лютага, якая нядаўна выйшла ў свет *.

Па дадзенай тэматыцы існуе багатая гістарыяграфія. Гэта шматлікія артыкулы і доктарская дысертацыя А. М. Карпачова «Сацыяльна-эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі ў другой палове XVII—XVIII ст.», кандыдацкая дысертацыя А. П. Ігнаценкі «Асноўныя рысы эканамічнага развіцця гарадоў Беларусі ў XVII—XVIII стст.», манаграфія В. У. Чапко «Гарады Беларусі ў першай палавіне XIX ст. (Эканамічнае развіццё)» і яе шматлікія артыкулы, кнігі А. П. Грыцкевіча «Прыватнаўладальніцкія гарады Беларусі ў XVI—XVIII стст. (Сацыяльна-эканамічнае даследаванне гісторыі гарадоў)», «Сацыяльная барацьба гараджан у XVI—XVIII стст.», артыкулы і кандыдацкія дысертацыі Ф. І. Адашчыка, А. Ф. Вішнеўскага, В. В. Шведа, кнігі і артыкулы М. Ф. Болбаса, М. Т. Раманоўскага і інш.

Пры даследаванні сацыяльна-эканамічнага развіцця гарадоў Беларусі на рубяжы дзвюх эпох — феадалізму і капіталізму — вельмі цяжка сказаць новае слова ў навуцы. Але А. М. Лютаму гэта ўдалося.

Скрупулёзнае вывучэнне архіўных фондаў ЦДГА ў Ленінградзе, ЦДГА Літоўскай ССР у Вільнюсе, ЦДГА БССР у Мінску і Гродна, іншых крыніц дазволіла аўтару даследаваць гарадское насельніцтва Беларусі, яго сацыяльны і нацыянальны састаў, прааналізаваць эканамічнае развіццё гарадоў і мястэчак, заняткі гараджан, разгледзець заканамернасці станаўлення капіталістычнай фармацыі, асаблівасці яе развіцця ў беларускіх гарадах.

У кнізе «Сацыяльна-эканамічнае развіццё гарадоў Беларусі ў канцы XVIII—першай палавіне XIX ст.» у адрозненне ад іншых даследаванняў значнае месца займае аналіз сацыяльнага развіцця беларускіх гарадоў на рубяжы феадальнай і капіталістычнай эпохі. А. М. Люты прыходзіць да вываду, што, нягледзячы на панаванне прыгонніцтва, якое тармазіла развіццё прадукцыйных сіл і абмяжоўвала сацыяльную базу папаўнення насельніцтва гарадоў Беларусі, у гэты перыяд назіраўся значны рост колькасці гарадскога насельніцтва, тэмпы якога перавышалі тэмпы росту сельскагаспадарчага і мястэчковага насельніцтва. Гэты працэс штучна паскараўся ссяленнем яўрэйскага насельніцтва з сельскай мясцовасці (больш за 70%).

Адной з цэнтральных праблем рэцэнзуемай манаграфіі з'яўляецца аналіз павіннасцей гарадскога насельніцтва. А. М. Люты даказвае, што ў працэнтных адносінах падатныя саслоўі ў канцы XVIII—пачатку XIX ст. склалі 88,9%, непадатныя — 11,1, а ў 50-х гадах XIX ст.— 82,2 і 17,8%. Такім чынам, некалькі вырасла ўдзельная вага непадатных саслоўяў, г. зн. прадстаўнікоў пануючага класа.

У вывучаемы перыяд адбывалася павелічэнне падаткаў і натуральных павіннасцей, што некалькі затрымлівала працэс фарміравання асноўных класаў капіталістычнага грамадства — буржуазіі і пралетарыяту. Нельга не пагадзіцца з заключэннем А. М. Лютага, што адсутнасць буйных прадпрымальнікаў у гарадах Беларусі ў дадзены перыяд аказала ўплыў і на ўзровень гарадской прамысловай вытворчасці, развіццё якой стрымлівалася адсутнасцю буйных купецкіх капіталаў.

У 1981 г. выйшла манаграфія В. У. Чапко па дадзенай праблеме. Ёсць пытанні, якія разглядаюцца ў абедзвюх кнігах,— развіццё гандлю, рамесная вытворчасць, мануфактурная прамысловасць, не гаворачы ўжо аб характарыстыцы насельніцтва гарадоў і мястэчак. У адрозненне ад В. У. Чапко А. М. Люты прысвячае цэлы раздзел умовам эканамічнага развіцця гарадоў і мястэчак Беларусі.

У канцы гэтага раздзела ён прыходзіць да вываду, што ў першай палавіне XIX ст. Беларусь стала часткай агульнарасійскай гаспадарчай сістэмы. Ва ўсіх сферах гаспадаркі адбывалася паступовае зараджэнне і фарміраванне капіталістычнага ўкладу. Аднак прыгонны лад затрымліваў развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці, што асабліва ярка праявілася ў Беларусі, дзе працягвала існаваць сістэма паншчыны. Палітыка царскага ўрада ў галіне арганізацыі гандлю і прамысловасці ў беларускіх губернях прыкметна ўплывала на гаспадарчае развіццё рэгіёна, тармозячы працэс разлажэння і крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы.

Даследуючы развіццё рамеснай вытворчасці, аўтар палемізуе з М. Ф. Болбасам, які адзначае, што ў Беларусі больш, чым у рускіх губернях, у гарадах і мястэчках былі распаўсюджаны рамёствы, і тлумачыць гэту з'яву слабым развіццём у іх мануфактурна-фабрычнай прамысловасці і наяўнасцю мяжы яўрэйскай аселасці. На думку

* Лютый А. М. Социально-экономическое развнтне городов Белорусснн в конце XVIII — первой половине XIX века. Минск: Наука н техника, 1987. 181 с.

аўтара рэцэнзуемай кнігі, асноўнай прычынай гэтага з'яўлялася амаль поўная адсутнасць адной з важнейшых умоў, неабходных для развіцця буйной прамысловасці,— значных капіталаў у купцоў і мяшчан.

А. М. Люты прыходзіць да заключэння, што канец XVIII — сярэдзіну XIX ст. у Беларусі можна лічыць пераходным перыядам, калі зараджаліся першыя расткі новага, капіталістычнага грамадства.

Адной з вартасцей рэцэнзуемай кнігі з'яўляецца наяўнасць 28 табліц, на падставе якіх складзена галіновая характарыстыка прамысловасці ў гарадах і мястэчках Беларусі, вызначана ступень развіцця гарадской і местачковай прамысловасці па губернях і інш.

На жаль, рэцэнзуемая кніга не пазбаўлена асобных недахопаў. Гэта датычыцца сцвярджэнняў аўтара, выказаных ва ўводзінах. Так, называючы работы А. В. Бурдзейкі, Д. І. Даўгялы, М. В. Доўнар-Запольскага, В. Д. Друшчыца, Ф. І. Забэлы, К. І. Кернажыцкага, У. І. Пічэты па сацыяльна-эканамічнаму развіццю гарадоў Беларусі, А. М. Люты адзначае, што ў іх прыводзяцца даныя аб развіцці эканомікі гарадоў Беларусі ў XVI—XVIII стст. Такой ацэнкай аўтар значна прыніжае вартасць даследаванняў савецкіх гісторыкаў 20—30-х гадоў.

Так, у вялікім артыкуле М. В. Доўнар-Запольскага «Сацыяльна-эканамічная структура Літоўска-Беларускай дзяржавы ў XVI—XVIII стст.» (1927) было дадзена агульнае ўяўленне аб развіцці гарадоў Беларусі ў XVI—XVIII стст. У ім становішча гарадоў разглядаецца ў сувязі са станам сялянскай гаспадаркі, яе рынкавых сувязей ва ўмовах купецкага гандлю. Уяўленне М. В. Доўнар-Запольскага аб лёсе беларускага феадальнага горада ўжо яўна адрознівалася ад поглядаў, якія панавалі ў буржуазнай гістарычнай навуцы. Ён у асноўным правільна паказаў тыя галоўныя сацыяльна-эканамічныя абставіны, якія тармазілі развіццё гарадоў Беларусі ў другой палавіне XVI—XVIII стст.

У кнізе сустракаюцца і недакладнасці. Так, на с. 165 даецца спасылка на работу Ф. І. Адашчыка «Эканамічнае развіццё беларускага горада ў XVIII— першай палавіне XIX ст. (на матэрыялах Віцебска)» (1963). Па-першае, дапушчана памылка ў назве работы (замест XVIII патрэбна XVII ст.), па-другое, няправільна прыведзены год выдання (патрэбна 1969).

Адзначаныя недахопы не зніжаюць навуковай каштоўнасці кнігі А. М. Лютага. Яна ўносіць пэўны ўклад у даследаванне гэтай важнай гістарычнай праблемы.

*Э. Р. ІОФЭ*

## НАША ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА

Выйшаў у свет навучальны дапаможнік па гістарыяграфіі БССР для студэнтаў гістарычных факультэтаў *, у якім дадзены сістэматызаваны аналіз багатай гістарыяграфічнай спадчыны гісторыі Беларусі феадальнага перыяду. Прадметам агляду з'яўляюцца манаграфіі, прысвечаныя найбольш актуальным праблемам аграрных адносін, класавай барацьбы, сацыяльна-эканамічнага жыцця гарадоў, а таксама даследаванні па палітычнай гісторыі і культуры. Аўтары ацэньваюць вартасць кожнай гістарыяграфічнай працы для разумення развіцця Беларусі ў IX—XIX стст., надаюць увагу метадалагічнай пазіцыі даследчыкаў, выбранай імі метадыцы асвятлення тэмы.

Беларускія летапісы, самыя старажытныя з якіх датуюцца канцом XIV — пачаткам XV ст., данеслі да нас звесткі аб найважнейшых з'явах гісторыі беларускага народа ва ўмовах феадальнай эпохі. Ідэйныя матывы, змест, методыка выкладання падзей, класавыя і палітычныя інтарэсы аўтараў гэтых помнікаў, іх тэарэтычныя прынцыпы, характэрныя рысы кожнага з гэтых своеасаблівых твораў сярэдневяковай беларускай гістарыяграфіі з'явіліся прадметам аналізу ў рэцэнзуемай працы. Выразная, аб'ектыўная, класавая ацэнка летапісаў — несумненная заслуга аўтараў дапаможніка.

Наступным этапам у вывучэнні гісторыі феадальнай Беларусі з'явілася дзейнасць дваранскіх гісторыкаў — у працах іх лепшых прадстаўнікоў В. Н. Тацішчава, М. Г. Устралава, К. Н. Бястужава-Руміна, С. М. Салаўёва, В. В. Ключэўскага, М. І. Кастамарава прыведзен рад цікавых матэрыялаў. Яны асвятлялі факты мінулага для апраўдання афіцыйнай палітыкі царызму ў Беларусі, якая разглядалася як састаўная частка Расійскай імперыі і не мела права на самастойнае існаванне за яе межамі. Аб Беларусі пісалася толькі ў сувязі з вывучэннем гісторыі Расіі.

Побач з вялікадзяржаўным поглядам гісторыкаў XIX ст. быў распаўсюджаны клерыкалізм. З такіх пазіцый асвятлялі мінулае А. В. Турчыновіч, М. В. Каяловіч, І. Д. Бяляеў, Н. І. Пятроў, І. І. Малышэўскі, П. Д. Брянцаў. Яны бачылі галоўную рухаючую сілу гістарычнага развіцця Беларусі ў рэлігійнай барацьбе, а ўсе сацыяльныя рухі зводзіліся да супрацьборства праваслаўя і каталіцызму. Нягледзячы на рад недахопаў дваранскай гістарыяграфіі, аўтары паказалі яе заслугі: яна паклала пачатак

* Копысский З. Ю., Чепко В. В. Историография БССР (эпоха феодализма): Учебное пособие / Под ред. Я. Н. Мараша. Минск: Университетское, 1986. 175 с.